ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэкатар установы адукацыі
"Беларуская дзяржаўная
акадэмія мастацтваў"

М.Р.Баразна
2024 г.

# ВОДЗЫЎ АПАНІРУЮЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

установы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"
на дысертацыю Шындлер Эліны Генадзьеўны
"Пластычны фальклор і фальклярызм у сучасным народным мастацтве Беларусі", прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.04 –
выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

Дысертацыйнае даследаванне Э. Г. Шындлер прысвечана выяўленню адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклярызму ў сучасным народным мастацтве Беларусі. Па сваім змесце дысертацыя Э. Г. Шындлер адпавядае галіне навукі, па якой яна прадстаўлена да абароны (мастацтвазнаўства), а таксама пашпарту спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура ў наступных галінах даследаванняў: выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура як асобныя віды мастацтва, іх своеасаблівасць і сутнасць; гісторыя выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і архітэктуры Беларусі; асаблівасці мастацкай творчасці асобных майстроў; мастацкія асаблівасці народнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Навуковы ўклад суіскальніка ў распрацоўку навуковай праблемы з ацэнкай яго значнасці.**

Упершыню ў айчынным мастацтвазнаўстве прадпрынята спроба комплекснага вывучэння праблемы фальклярызацыі пластычных відаў народнага мастацтва, а таму ўсе палажэнні, якія выносяцца аўтарам на абарону, маюць высокую ступень навізны і навуковай значнасці.

Унікальнасць дысертацыі Э. Г. Шындлер заключаецца ў тым, што гэта першае даследаванне ў айчынным мастацтвазнаўстве, у якім народнае мастацтва разглядаецца праз прызму катэгорый «пластычны фальклор» і «пластычны фалькларызм». Тэма дысертацыі, пастаўленыя задачы і мэта даследавання адпавядаюць патрэбам навуковай супольнасці, сучасным запытам грамадства і ўдзельнікаў мастацкай дзейнасці ў галіне народнага мастацтва, што вызначае актуальнасць работы, яе навуковую, сацыяльную і культурную значнасць.

Тэма фальклaрызацыі пластычных відаў мастацтва заставалася да сённяшняга часу па-за ўвагай айчынных мастацтвазнаўцаў, праблема толькі акрэслівалася даследчыкамі, для гэтага ўжываліся розныя азначэнні – трансфармацыя мастацкай формы, аўтарская пластыка ў галіне традыцыйнага мастацтва, мастацкае пераасэнсаванне народнага мастацтва, сучасныя інтэрпрэтацыі па матывах народнай творчасці. Але грунтоўных даследаванняў па азначанай тэме не было прадстаўлена. Таму даследчыцкая работа, праведзеная Э. Г. Шындлер, з'яўляецца наватарскай. Аналітычны матэрыял і вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца навуковай супольнасцю як падмурак для далейшай распрацоўкі праблемы фальклaрызацыі пластычных відаў народнай творчасці.

Мэта даследавання патрабуе ад аўтара структуравання тэрміналагічнага падмурку і паглыбленай распрацоўкі метадалагічных прынцыпаў даследавання з прычыны слабай распрацаванасці тэмы ў айчынным мастацтвазнаўстве і адсутнасці апрабаваных метадаў для такога роду даследаванняў. Пастаўленыя задачы тэрміналагічнага і метадалагічнага характару былі паспяхова вырашаны Э. Г. Шындлер у рамках даследавання, тым самым аўтар зрабіла значны ўклад у распрацоўку тэрміналагічнага і метадалагічнага падмурку для далейшага вывучэння праблемы трансфармацыі мастацкай формы ў народным мастацтве.

Для мастакоў і майстроў народнай творчасці каштоўным з пункту погляду практычнай значнасці з'яўляецца выяўлены і акрэслены аўтарам комплекс адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фалькларызму для ручнога ткацтва, ганчарства і саломапляцення.

Важным унёскам з пункту погляду сацыяльнай і ідэалагічнай значнасці з'яўляецца распрацаваны Э. Г. Шындлер алгарытм вызначэння ступені фальклaрызаванасці сучасных відаў народнага мастацтва, які можа выкарыстоўвацца ўсімі ўдзельнікамі працэсаў адраджэння і захавання традыцыйнай спадчыны.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія суіскальніку можа быць прысвоена шуканая вучоная ступень.**

Экспертыза прадастаўленай на абарону кандыдацкай дысертацыі Э. Г. Шындлер дазваляе зрабіць выснову аб тым, што пастаўленая мэта даследавання, якая заключаецца ў вызначэнні адзнак пластычнага фальклору і праяў фальклярызму ў сучасным народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі, дасягнута.

Размежаванне розных па сутнасці мастацкіх працэсаў, праведзенае ў рамках кандыдацкай дысертацыі Э. Г. Шындлер, адкрывае большыя магчымасці для развіцця як напрамку сучаснага мастацкага пераасэнсавання народнай традыцыі, так і захавання этнавызначальнага пласта сялянскай традыцыйнай пластыкі як каштоўнай для культуры мастацкай з'явы ў яе вытворчай, функцыянальнай, мастацкай і семантычнай цэласнасці.

Неабходнасць размежавання адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклярызму ў сучасным народным мастацтве дыктуецца сучаснымі тэндэнцыямі: пашырэннем рынку тавараў у стылістыцы народных традыцый, праблемамі захавання этнічнай самабытнасці беларускай культуры ва ўмовах глабальнай уніфікацыі культур, разрывам пераемнасці традыцый паміж пакаленнямі.

Увядзенне Э. Г. Шындлер у навуковы і мастацкі ўжытак тэрмінаў «пластычны фальклор» і «пластычны фальклярызм» у тым аб'ёме значэнняў, які прапануецца ў дысертацыі, з'яўляецца важным крокам да дыферэнцыяцыі дагэтуль слаба размежаванага пласта мастацтва з азначэннем «народнае» і выпрацоўкі прыдатных спосабаў і метадаў вывучэння для кожнага з выдзеленых напрамкаў.

Атрыманыя вынікі могуць знайсці прымяненне ў навуковых даследаваннях, планаванні і прагназаванні сацыяльнага развіцця, адукацыйнай тэорыі і практыцы, ідэйна-выхаваўчай рабоце, а таксама ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і дызайну.

Вучоная ступень кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура можа быць прысвоена Э. Г. Шындлер за наступныя навуковыя вынікі:

– абгрунтаванне неабходнасці і мэтазгоднасці ўвядзення ў навуковы ўжытак тэрмінаў «пластычны фальклор», «пластычны фальклярызм»;

– выяўленне адзнак пластычнага фальклору ў гістарычным працэсе іх узнікнення і развіцця ў ручным ткацтве, ганчарстве, саломапляценні;

– вызначэнне і сістэматызацыю найбольш характэрных для беларускага народнага мастацтва праяў пластычнага фальклярызму;

– вызначэнне ступені фальклярызаванасці сучаснага народнага мастацтва.

**Заўвагі па дысертацыі.**

1. Рздзел 3.1 дысертацыі, прысвечаны выяўленню адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклярызму ў ручным называецца «Рэдукаванасць фальклорнай традыцыі як асаблівасць сучаснага ткацтва», але па сутнасці такая асаблівасць як рэдукаванасць традыцыі ўласціва ўсім сучасным відам народнага мастацтва, а таму назва не зусім дакладна адлюстроўвае спецыфіку фальклярызацыі ў згаданым відзе рамяства.

2. Нельга не згадзіцца з выказваннем аўтара аб тым, што пластычны фальклярызм не з'яўляецца з'явай адмоўнай. Э. Г. Шындлер падкрэслівае ва ўводзінах, што "адмоўным з'яўляецца трансляванне і папулярызацыя такіх форм пад выглядам гістарычнай традыцыйнай спадчыны, што прыводзіць да скажэння традыцый і размывання этнавызначальных рыс традыцыйнага беларускага мастацтва». Тым не менш, у раздзеле 2.2 дысертацыі «Пластычны фальклярызм як галоўная асаблівасць сучаснага народнага мастацтва» аўтар характарызуе пластычны фальклярызм як мастацкі напрамак "не абмежаваны ў выбары сродкаў мастацкай выразнасці светапогляднымі, вытворчымі ці мастацкімі прынцыпамі", у якім "варыятыўнасць мастацкіх напрамкаў, з'яў і твораў пластычнага фальклярызму амаль не мае межаў". Такое выказванне аўтара наводзіць на думку, што сучасныя інтэрпрэтацыі традыцыйнага мастацтва з'яўляюцца чымсьці легка дасягаемым і не заўжды прадуманым у мастацкіх адносінах, а з'яўляюцца вынікам выпадковай варыятыўнасці. З гэтым нельга згадзіцца, бо выкананне любога сучаснага мастацкага твора, у тым ліку і накіраванага на пераасэнсаванне традыцыйнага мастацтва, таксама абмежавана пэўнымі правіламі, тэхнікамі і законамі – напрыклад, пабудовы кампазіцыі, колеравых спалучэнняў, а таксама сучаснымі светапогляднымі ўяўленнямі, тэндэнцыямі і запытамі грамадства.

3. У дысертацыі сустракацца пэўныя стылістычныя недакладнасці, выкліканыя складанай тэрміналагічнай структурай, распрацаванай аўтарам дысертацыі.

4. Параграф 1.2 абазначаны як "Тэарэтычныя прынцыпы даследавання", а падпараграфы раскрываюць не прынцыпы, а тэрміны.

5. Выкарыстанне паняцця "парадыгма" не ў поўнай ступені адпавядае сэнсу.

6. У працы гасам сустракаюцца стылістычныя і арфаграфічныя памылкі.

Выказаныя заўвагі і пажаданні не носяць прынцыповага характару, не ставяць пад сумнеў вынікі вялікай і руплівай працы, праведзенай за многія гады, але патрабуюць дадатковых тлумачэнняў аўтара.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Прадстаўленая дысертацыя, узровень аналізу і раскрыцця выбранай тэмы сведчаць пра тое, што навуковая кваліфікацыя Э. Г. Шындлер адпавядае вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

**Канкрэтныя рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў дысертацыі.**

Навукова-практычная значнасць працы абумоўлена ў магчымасцю выкарыстання матэрыялаў і высноў для далейшых навуковых даследаванняў праблемы фальклярызацыі сучаснага народнага мастацтва.

Аналітычны матэрыял і вынікі дысертацыі могуць стаць асновай для распрацоўкі навучальных праграм, метадычных дапаможнікаў, праграм семінараў і лекцый па праблемах народнага мастацтва, спецкурсаў у галіне дызайну, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама выкарыстоўвацца для вырашэння шырокага кола мастацкіх задач.

Вынікі аналітычнай работы па размежаванні адзнак пластычнага фальклору і праяў фальклярызму ў ручным ткацтве, ганчарстве і саломапляценні з’яўляюцца каштоўным матэрыялам для мастакоў і майстроў, занятых у галіне традыцыйнага мастацтва. Матэрыялы дысертацыі будуць спрыяць павышэнню ўзроўня мастацкай творчасці майстроў сістэмы народных рамёстваў і мастацкіх промыслаў.

Алгарытм вызначэння адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклярызму можа выкарыстоўвацца спецыялістамі, занятымі ў галіне адраджэння і захавання традыцыйнай спадчыны.

**Вывад.**

Дысертацыя Э. Г. Шындлер змяшчае прынцыпова новыя навуковыя вынікі, якія з'яўляюцца значным дасягненнем у галіне мастацтвазнаўства. Атрыманыя ў ходзе дысертацыйнага даследавання новыя навуковыя вынікі садзейнічаюць забеспячэнню прыярытэту Рэспублікі Беларусь у адпаведнай галіне навукі.

Дысертацыя Э. Г. Шындлер адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый, устаноўленых пп. 20, 21

Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў ад 17.11.2004 № 560 (у рэдакцыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 02.06.2022 № 190), а яе аўтару можа быць прысвоена вучоная ступень кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура за комплекснае інавацыйнае даследаванне праблем фалькларызацыі сучаснага народнага мастацтва.

Водзыў на дысертацыю Э. Г. Шындлер згодна з загадам рэктара ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў" ад 16.05.2024 № 79 разгледжаны на Навуковым савеце 04 чэрвеня 2024 г., пратакол №9.

Э.Г. Шындлер выступіла з дакладам. Адбылася дыскусія, суіскальнік адказала на ўсе пытанні. У працы семінара і ў галасаванні па прыёме водзыва на дысертацыю прынялі ўдзел 16 чалавек, якія маюць вучоныя ступені і званні.

Вынікі галасавання: «за» – 16, «супраць» – 0, «устрымаліся» – 0.

Даецца згода на размяшчэнне водзыву на сайце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Эксперт апаніруючай арганізацыі,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт — Я. Ф. Шунейка

Старшыня вучонага савета,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт — А. А. Ротмірава

Сакратар вучонага савета,
кандыдат псіхалагічных навук — В. С. Машарская

ПОДПІС СВЕДЧУ
Спецыяліст па кадрах аддзела кадраў
А.С.Мелюк
06.06.2024